**АКТУАЛЬНАЕ ІНТЭРВ'Ю**

# *Сяргей ЛІНГ:* «БЕЗ РАЗВІТОГА РЫНАЧНАГА МЕХАНІЗМА НЕ МОЖА ІСНАВАЦЬ ВЫСОКАЭФЕКТЫЎНАЙ ЭКАНОМІКІ»

## АДКАЗЫ НАМЕСНІКА СТАРШЫНІ САВЕТА МІНІСТРАЎ, СТАРШЫНІ ДЗЯРЖЭКАНОМПЛАНА С.С. ЛІНГА НА ПЫТАННІ РЭДАКЦЫІ ГАЗЕТЫ «ЗВЯЗДА»

**— Сёлетняя восень разам з устойліва дрэнным надвор'ем, амаль штодзённымі дажджамі адметная яшчэ і істотным пагаршэннем эканамічнай сітуацыі ў рэспубліцы. Скочуць цэны, на мяжы закрыцця апынулася большасць буйных прадпрыемстваў, зусім дрэнна з палівам. Гэтыя прыкметы далейшага паглыблення крызісу былі ўспрыняты ў грамадстве з ціхай злосцю, аднак без асаблівых эмоцый. Людзі стаміліся. Закранула іх, выклікала жывую рэакцыю ўсяго насельніцтва падпісанне ў Маскве пагаднення шасці былых савецкіх рэспублік аб стварэнні рублёвай зоны «новага тыпу». Але новае — не заўсёды лепшае. Што чакае нашу эканоміку ў гэтай зоне? Ці можна спадзявацца на аслабленне інфляцыйнай пятлі?**

— Перш за ўсё мне здаецца, што вы ў сваім пытанні пачынаеце нагнятаць сітуацыю. Таму давайце разбірацца спакойна. Пачнём з паняцця «рублёвая зона». Зона якой-небудзь валюты — гэта група краін, якія маюць найбольш развітыя эканамічныя сувязі, а значыць — вялікі аб'ём плацежна-разліковых адносін. Як правіла, тут лідзіруе дзяржава з найбольшым эканамічным патэнцыялам.

У гэтым сэнсе для большасці краін былога Саюза расійскі рубель застаецца базавай валютай, што тым больш важна для нашай рэспублікі, якая мае пераважны аб'ём гандлёва-эканамічных сувязей з Расіяй.

Заключаныя пагадненні выводзяць не толькі на тое, што ў абарачэнні ў нас будуць рублі новага ўзору 1993 года, а на свядомую, узаемавыгадную інтэграцыю эканомік дзяржаў, якія падпісалі пагадненні.

Пры гэтым ліквідуюцца ўсе перашкоды на шляху перамяшчэння тавараў, рэсурсаў, капіталаў і рабочай сілы з мэтай дасягнення максімальнай эфектыўнасці ў падзеле працы і вытворчасці.

Нашы прадпрыемствы, якія мелі раней свабодны доступ на рынкі Расіі і іншых рэспублік былога Саюза, у апошні час сутыкнуліся з мытнымі бар'ерамі, ускладненнем разлікаў за набытую і пастаўленую прадукцыю. Натуральна, усё гэта не магло не адбіцца на падзенні вытворчасці, узвінчванні цэнаў і на агульным стане эканомікі. І як толькі ў поўным аб'ёме запрацуюць падпісаныя пагадненні, істотна зменіцца і фон эканамічных адносін унутры СНД, а значыць — некалькі змякчыцца шэраг вострых праблем, асабліва звязаных з цэнавым прэсінгам на завозімыя рэсурсы з-за пошлін, падаткаў і мытных тарыфаў.

Іншая справа, што і цешыцца надзеямі тут асабліва не варта. Ніхто нас на сваё ўтрыманне не возьме. Адносіны павінны быць узаемавыгадныя, тым больш, што



ўвесь механізм пагадненняў запрацуе ў поўнай меры не сёння і не заўтра. Патрабуецца некалькі месяцаў, пакуль будуць унесены папраўкі ў заканадаўчыя акты і пакуль пойдзе нармальнае супрацоўніцтва ў новай структуры адносін. Тое, што было хутка разбурана, давядзецца аднаўляць — я маю на ўвазе нармальныя ўмовы ўзаемнага гандлю і вытворчай кааперацыі — на працягу некалькіх гадоў.

Пагадненне шасці дзяржаў арыентуе на тое, каб гэты працэс ішоў хутчэй, аднак усё залежыць ад настойлівасці і паслядоўнасці дзяржаў — удзельніц пагаднення.

Гэтымі днямі на сустрэчы кіраўнікоў дзяржаў і ўрадаў у Маскве падпісаны найбольш поўны дакумент — Дагавор аб эканамічным саюзе, у якім удзельнічае большасць краін былога СССР. Гэта з'яўляецца найважнейшым станоўчым фактарам. Тое, што можна зрабіць сёння, мы дамовіліся з Расіяй ужо цяпер рэалі-

Прэзідэнцкая бібліятэка Рэспублікі Беларусь

**З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы**